**ВЯРХОЎНЫ СУД**
**Рэспублікі Беларусь**

вул.Леніна, 28, 220681, г.Мінск,
тэл. (017) 226-12-06, факс (017) 227-12-25
E-mail: scjustrb@pmrb.by

**ВЕРХОВНЫЙ СУД**
**Республики Беларусь**

ул.Ленина, 28, 220681, г.Минск,
тел. (017) 226-12-06, факс (017) 227-12-25
E-mail: scjustrb@pmrb.by

24.12.2008 № 03-1435

На № ________ ад ________

г.Мінск,
Сморгаўскі праезд, д. 3-1
Грамадскае аб'яднанне
"Праваабарончы цэнтр "Вясна"

Ваша скарга разгледжана.

Рашэннем Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 2003 года задаволены іск Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб ліквідацыі грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна".

У нагляднай скарзе просіце аб адмене рашэння як не заснаванага на законе.

Скарга не падлягае задавальненню па наступных падставах.

У адпаведнасці з п. 2 арт. 57 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь юрыдычная асоба можа быць ліквідавана па рашэнню суда ў выпадку ажыццяўлення дзейнасці без належнага дазволу (ліцэнзіі) або дзейнасці, забароненай заканадаўствам, або ў сувязі з іншымі неаднаразовымі ці грубымі парушэннямі заканадаўства.

Судом устаноўлена, што ў ходзе выбарчай кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь грамадскае аб'яднанне "Праваабарончы цэнтр "Вясна" парушала ўстаноўлены парадак накіравання назіральнікаў на пасяджэнні камісій па выбарах і на выбарчыя ўчасткі для галасавання.

Гэтыя абставіны пацверджаны пісьмовым папярэджаннем Міністэрства юстыцыі ад 28 жніўня 2001 года, якое грамадскае аб'яднанне не абскардзіла, і пастановай Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ад 8 верасня 2001 г., зробленай на падставе праверак,

праведзеных Міністэрствам юстыцыі і Пракуратурай Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з выкладзеным суд прыйшоў да правільнай высновы, што парушэнні патрабаванняў выбарчага заканадаўства з'яўляюцца грубымі, і ў адпаведнасці з п. 2 арт. 57 Грамадзянскага кодэкса прыняў правільнае рашэнне аб ліквідацыі аб'яднання.

Грамадскае аб'яднанне з'яўляецца юрыдычнай асобай, таму на яе распаўсюджваюцца патрабаванні арт. 57 Грамадзянскага кодэкса, які прадугледжвае падставы для ліквідацыі юрыдычных асоб, у тым ліку і грамадскіх аб'яднанняў.

У сувязі з гэтым ваша скарга пакінута без задавальнення.

Намеснік Старшыні
Вярхоўнага Суда
Рэспублікі Беларусь В.М.Вышкевіч